Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт
GISTORYYA DEHKARATYЎNA-PRYKLADNOGA MASTACTVA UP.pdf
культуры і
мастацтваў»

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Першы прарэктар БДУКМ
____________________А. А. Корбут
«____» ______________2017 г.
Рэгістрацыйны № ВД- ______ / вуч.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ПРАВАВОЕ ЗАБЕСПЯЧЭННЕ ДЗЕЙНАСЦІ БІБЛІЯТЭК

*Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі*
*па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасці*
*1-23 01 11 Бібліятэчна-інфармацыйная дзейнасць (па напрамках),*
*напрамку спецыяльнасці 1-23 01 11-01 Бібліятэчна-інфармацыйная дзейнасць (менеджмент)*

2017

Вучэбная праграма складзена на аснове адукацыйнага стандарту вышэйшай адукацыі I ступені ОСВО 1-23-01 11-2014 па спецыяльнасці 1-23 01 11 Бібліятэчна-інфармацыйная дзейнасць (па напрамках), вучэбнага плана ўстановы вышэйшай адукацыі па напрамку спецыяльнасці 1-23 01 11-01 Бібліятэчна-інфармацыйная дзейнасць (менеджмент), рэгістрацыйны нумар Е 23-1-45/14 вуч. ад 24.02.2014 г.

**СКЛАДАЛЬНІК**

*Ю. М. Галкоўская*, дацэнт кафедры менеджменту інфармацыйна-дакументнай сферы ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат педагагічных навук

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**

*Л. А. Аўгуль,* загадчык навукова-даследчага аддзела бібліятэказнаўства дзяржаўнай установы «Цэнтральная навуковая бібліятэка імя Якуба Коласа Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі»;
*Н. А Ляйко,* прафесар кафедры інфармацыйных рэсурсаў установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат гістарычных навук, дацэнт

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**

*кафедрай* менеджменту інфармацыйна-дакументнай сферы ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 2 ад 21.10.2016 г.);
*прэзідыумам* навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 2 ад 08.12.2016 г.)

Адказны за рэдакцыю: В. Б. Кудласевіч
Адказны за выпуск: Ю. М. Галкоўская

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вучэбная дысцыпліна «Прававое забеспячэнне дзейнасці бібліятэк» (кампанент установы вышэйшай адукацыі) уваходзіць у комплекс прадметаў, неабходных для падрыхтоўкі бібліятэкараў-бібліёграфаў вышэйшай кваліфікацыі, забяспечвае прафесійную падрыхтоўку бібліятэчных спецыялістаў у сферы арганізацыі бібліятэчнай справы, прававых асноў функцыянавання бібліятэчна-інфармацыйных устаноў, садзейнічае развіццю прафесійна арыентаванай прававой кампетэнцыі, фарміруе веды і ўменні, неабходныя для кіравання бібліятэкай як сацыяльным інстытутам.

Актуальнасць вывучэння вучэбнай дысцыпліны абумоўлена важнасцю валодання спецыялістамі інфармацыйнай сферы сучаснымі прававымі ведамі і ўменнямі для ажыццяўлення прафесійнай дзейнасці на прававой аснове. Бібліятэка як сацыяльны інстытут, што дзейнічае ў інфармацыйнай сферы, уступае ў цэлы шэраг грамадскіх адносін, якія рэгулююцца прававымі нормамі. Гэта адносіны, якія ўзнікаюць пры абслугоўванні карыстальнікаў, фарміраванні інфармацыйных рэсурсаў, кіраванні бібліятэкай. Перад бібліятэкарам-бібліёграфам як бібліятэчным спецыялістам сярод іншых стаяць задачы: забяспечваць рэалізацыю права грамадзян на бібліятэчнае, інфармацыйнае і даведачна-бібліяграфічнае абслугоўванне, выконваць заканадаўства аб аўтарскім праве пры арганізацыі доступу да інфармацыі, спрыяць распаўсюджванню прававой інфармацыі праз публічныя цэнтры прававой інфармацыі пры бібліятэках, садзейнічаць павышэнню прававой культуры насельніцтва. Эфектыўная рэалізацыя гэтых задач у перыяд, калі інтэнсіўна развіваюцца тэхналогіі пошуку, апрацоўкі, захоўвання, прадастаўлення інфармацыі, здзяйсняльная толькі пры наяўнасці прафесійна значных прававых ведаў, уменняў і вопыту ў бібліятэкара-бібліёграфа.

Вучэбная дысцыпліна структуравана па раздзелах і тэмах, якія ўяўляюць сабой адносна самастойныя ўзбуйненыя дыдактычныя адзінкі зместу навучання. Змест тэм абапіраецца і спалучаецца з набытымі студэнтамі ведамі і ўменнямі пры вывучэнні цыкла агульнанавуковых і агульнапрафесійных дысцыплін – «Асновы кіравання інтэлектуальнай уласнасцю», «Тэо-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

рыя інфармацыі і дакументалогія», «Бібліятэказнаўства» і цыкла спецыяльных дысцыплін – «Інфармацыйныя рэсурсы», «Бібліятэчна-інфармацыйнае абслугоўванне», «Бібліятэчна-інфармацыйны маркетынг і менеджмент». У сваю чаргу веды і ўменні, атрыманыя пры вывучэнні гэтай дысцыпліны, з'яўляюцца асновай для засваення матэрыялу асобных дысцыплін, такіх як «Эканоміка бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці», «Тэхналагічны бібліятэчны менеджмент», «Кіраванне персаналам бібліятэкі і менеджмент якасці дзейнасці бібліятэк».

*Мэта вучэбнай дысцыпліны* – засваенне студэнтамі тэарэтычных заканамернасцей развіцця бібліятэчнага заканадаўства, яго спецыфікі, прававых асноў функцыянавання бібліятэчна-інфармацыйных устаноў, асаблівасцей арганізацыі выканання прававых прадпісанняў, замацаваных у нарматыўных прававых актах, рэгулюючых дзейнасць бібліятэк.

Мэтавая накіраванасць вучэбнай дысцыпліны абумоўлівае кола *задач:*

– пазнаёміць студэнтаў з асноўнымі паняццямі і тэрміналогіяй вывучаемай дысцыпліны;

– сфарміраваць на аснове міждысцыплінарнага падыходу сістэмныя веды аб прававых асновах функцыянавання бібліятэчна-інфармацыйных устаноў; аб правах і абавязках суб'ектаў праваадносін у сферы дзейнасці бібліятэк, прынцыпах, якія ляжаць у аснове прававога рэгулявання дзейнасці бібліятэк; структуры бібліятэчнага заканадаўства; аб'ектах і суб'ектах аўтарскага права, комплексе лакальных нарматыўна-прававых дакументаў, якія забяспечваюць арганізацыйную дзейнасць бібліятэчнай установы;

– сфарміраваць уменне прымяняць прававыя нормы для рашэння прафесійных задач, аказваць кансультатыўна-прававую дапамогу ў працэсе абслугоўвання ў публічных цэнтрах прававой інфармацыі, якія функцыянуюць пры бібліятэках;

– раскрыць патэнцыял сістэмы прававых ведаў як інструмента кіравання ў бібліятэчна-інфармацыйнай сферы;

– сфарміраваць прафесійна арыентаваную прававую кампетэнцыю, разуменне значнасці прававых паводзін для развіцця і ўдасканалення бібліятэк;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– развіццё здольнасці да пастаяннай самаадукацыі ў галіне прававых асноў дзейнасці бібліятэчна-інфармацыйных установаў, здольнасці да эфектыўнай самарэалізацыі ў прафесіі.

Зместам вучэбнай дысцыпліны «Прававое забеспячэнне дзейнасці бібліятэк» прадугледжана фарміраванне наступных кампетэнцый у адпаведнасці з адукацыйным стандартам вышэйшай адукацыі першай ступені па спецыяльнасці 1-23 01 11 Бібліятэчна-інфармацыйная дзейнасць (па напрамках).

**Акадэмічныя кампетэнцыі:**

АК-1. Умець выкарыстоўваць базавыя навукова-тэарэтычныя веды для вырашэння тэарэтычных і практычных задач.

АК-2. Валодаць сістэмным і параўнальным аналізам.

АК-3. Валодаць даследчымі навыкамі.

АК-4. Умець працаваць самастойна.

АК-5. Быць здольным параджаць новыя ідэі (валодаць крэатыўнасцю).

АК-6. Валодаць міждысцыплінарным падыходам да вырашэння праблем.

АК-7. Мець навыкі, звязаныя з выкарыстаннем тэхнічных устройстваў, кіраваннем інфармацыяй і работай з камп'ютарам.

АК-8. Валодаць навыкамі вуснай і пісьмовай камунікацыі.

АК-9. Умець вучыцца, павышаць сваю кваліфікацыю на працягу ўсяго жыцця.

АК-10. Валодаць метадычнымі ведамі і даследчымі ўменнямі, якія забяспечваюць вырашэнне задач інавацыйна-метадычнай і навукова-даследчай дзейнасці ў галіне бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці.

**Сацыяльна-асобасныя кампетэнцыі:**

САК-7. Быць здольным асэнсавана ўспрымаць і беражліва адносіцца да гістарычнай, культурнай спадчыны Беларусі і свету, культурных традыцый і рэлігійных поглядаў.

**Прафесійныя кампетэнцыі:**

*Вытворча-тэхналагічная дзейнасць*

ПК-7. Фарміраваць інфармацыйную культуру карыстальнікаў.

*Інавацыйна-метадычная дзейнасць*

ПК-13. Аказваць кансалтынгавую дапамогу па разнастайных кірунках бібліятэчна- інфармацыйнай дзейнасці.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ПК-14. Распрацоўваць метадычныя матэрыялы і рэкамендацыі, арганізацыйна-тэхналагічную дакументацыю.

*Навукова-даследчая дзейнасць*

ПК-15. Выкарыстоўваць сучасныя дасягненні навукі і перадавых тэхналогій і ўкараняць іх у практычную дзейнасць.

*Арганізацыйна-кіраўніцкая дзейнасць*

ПК-18. Выконваць патрабаванні заканадаўчых і нарматыўна-прававых дакументаў у галіне бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці.

ПК-20. Выконваць асноўныя функцыі кіравання структурнымі падраздзяленнямі бібліятэк; кантраляваць і падтрымліваць у іх працоўную і вытворчую дысцыпліну.

Спецыяліст па напрамку спецыяльнасці 1-23 01 11-01 Бібліятэчна-інфармацыйная дзейнасць (менеджмент), акрамя таго, павінен быць здольным:

*Вытворча-тэхналагічная дзейнасць*

ПК-26. Арганізоўваць дакументацыйнае забеспячэнне кіравання бібліятэкай.

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны студэнт павінен *ведаць:*

– тэарэтычныя асновы прававога забеспячэння дзейнасці бібліятэк;

– заканадаўчую і адміністратыўную сістэму кіравання бібліятэчнай справай краіны;

– заканадаўства ў галіне бібліятэчнай справы краіны: профільныя нарматыўныя прававыя акты, якія рэгулююць дзейнасць бібліятэк, і акты сумежнага заканадаўства;

– прынцыпы, якія ляжаць у аснове прававога рэгулявання дзейнасці бібліятэк;

– правы і абавязкі суб’ектаў прававога рэгулявання ў сферы дзейнасці бібліятэк;

– прававы статус бібліятэкара-бібліёграфа і прававы статус яго партнёраў па адносінах;

– сістэму праваадносін, якія ўзнікаюць у працэсе функцыянавання бібліятэк;

– комплекс лакальных нарматыўных прававых актаў, якія забяспечваюць арганізацыйную дзейнасць бібліятэкі;

– асаблівасці прававога рэгулявання адносін, якія ўзнікаюць пры стварэнні, ліквідацыі, развіцці бібліятэк і бібліятэчных се-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

так, фарміраванні інфармацыйных рэсурсаў бібліятэк, абслугоўванні карыстальнікаў, узаемадзеянні работадаўцы з кадрамі, фарміраванні і выкарыстанні матэрыяльна-тэхнічнай базы бібліятэк;

*умець:*

– працаваць з юрыдычнай літатарурай;

– ажыццяўляць дзейнасць па распрацоўцы арганізацыйна-распараджальных і нарматыўных дакументаў бібліятэкі, ствараць лакальны пакет прававых дакументаў, рэгулюючых дзейнасць бібліятэчна-інфармацыйных устаноў;

– выкарыстоўваць нарматыўныя прававыя акты пры рашэнні прафесійных задач;

– рэалізоўваць і абараняць правы і інтарэсы бібліятэкі, карыстальнікаў бібліятэк і іншых суб'ектаў грамадскіх адносін, што ўзнікаюць у працэсе жыццядзейнасці бібліятэк;

– аказваць кансультатыўна-прававую дапамогу ў публічных цэнтрах прававой інфармацыі, што дзейнічаюць пры бібліятэках;

– інтэграваць тэарэтычныя прававыя веды, звязаныя з дзейнасцю бібліятэк, з практычнай дзейнасцю;

*валодаць:*

– тэрмінамі і паняццямі бібліятэчнага заканадаўства;

– методыкай пошукавай дзейнасці ў сістэме нарматыўных прававых актаў, якія рэгулююць дзейнасць бібліятэк;

– тэхналогіяй распрацоўкі лакальных нарматыўных прававых дакументаў.

Для кіравання вучэбным працэсам і арганізацыі кантрольна-ацэначнай дзейнасці выкладчыкам рэкамендуецца выкарыстоўваць рэйтынгавую сістэму ацэнкі вучэбна-пазнавальнай і даследчай дзейнасці студэнтаў, варыятыўныя мадэлі кіруемай самастойнай работы, вучэбна-метадычныя комплексы.

Паспяховаму засваенню вучэбнай дысцыпліны спрыяе ўключэнне заданняў па дысцыпліне ў праграму вытворчай практыкі.

У адпаведнасці з вучэбным планам на вывучэнне вучэбнай дысцыпліны «Прававое забеспячэнне дзейнасці бібліятэк» адведзена 104 гадзіны, з якіх 40 гадзін – аўдыторныя заняткі. Прыкладнае размеркаванне аўдыторных гадзін па відах заняткаў: 18 гадзін – лекцыі, 6 гадзін – семінарскія заняткі, 16 гадзін – практычныя заняткі.

Рэкамендаваная форма кантролю ведаў студэнтаў – экзамен.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

### Уводзіны

Прадмет, змест і задачы вучэбнай дысцыпліны «Прававое забеспячэнне дзейнасці бібліятэк». Яе месца ў сістэме прафесійнай падрыхтоўкі будучага спецыяліста. Практычная накіраванасць вучэбнай дысцыпліны. Веды і ўменні, якія набываюць студэнты ў працэсе вывучэння вучэбнай дысцыпліны. Яе ўзаемасувязь з іншымі вучэбнымі дысцыплінамі цыкла спецыяльных дысцыплін. Асноўныя віды вучэбных заняткаў і арганізацыя самастойнай работы студэнтаў. Формы кантролю. Забяспечанасць вучэбнай дысцыпліны вучэбна-метадычнай дакументацыяй.

### Раздзел 1. БІБЛІЯТЭКА Ў СІСТЭМЕ ПРАВАВЫХ АДНОСІН

*Тэма 1. Бібліятэка як суб’ект дзяржаўнага кіравання і прававога рэгулявання*

Дзяржаўная палітыка як асноватворны інструмент дзяржаўнага кіравання ў галіне бібліятэчнай справы. Абавязкі органаў дзяржаўнай улады ў працэсе рэалізацыі дзяржаўнай палітыкі. Асноўныя ўмовы эфектыўнага правядзення дзяржаўнай палітыкі. Асноўныя віды дзяржаўнай палітыкі, якія непасрэдна ўплываюць на стан і развіццё бібліятэчнай справы ў Рэспубліцы Беларусь (дзяржаўная культурная палітыка, дзяржаўная бібліятэчная палітыка, дзяржаўная палітыка ў сферы інфарматызацыі).

Прынцыпы інфармацыйнага права як аснова прававога рэгулявання дзейнасці бібліятэк. Асноўныя аб’екты і суб’екты праваадносін у сферы дзейнасці бібліятэк. Бібліятэка як сацыяльны інстытут, які ўступае ў комплекс праваадносін і мае свае асаблівыя правы і абавязкі. Правы і абавязкі бібліятэк Рэспублікі Беларусь.

Асноўныя групы праваадносін, у якія ўступаюць бібліятэкі ў працэсе функцыянавання: пры стварэнні, ліквідацыі і развіцці бібліятэк, бібліятэчных сетак; пры фарміраванні інфармацыйных рэсурсаў бібліятэк; пры ажыццяўленні інфармацыйнага, бібліятэчнага, даведачна-бібліяграфічнага абслугоўваня ка-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

рыстальнікаў; пры ўзаемадзеянні работадаўцы з персаналам (кадрамі); пры фарміраванні і выкарыстанні матэрыяльна-тэхнічнай базы бібліятэк.

Юрыдычны статус і правааздольнасць бібліятэк Рэспублікі Беларусь.

*Тэма 2. Сутнасць прававога забеспячэння дзейнасці бібліятэк*

Прававое забеспячэнне дзейнасці бібліятэк: змест паняцця. Інстытуты ўлады і грамадска-прафесійныя інстытуты, якія забяспечваюць распрацоўку нарматыўных прававых актаў, што ляжаць у аснове жыццядзейнасці бібліятэк. Узроўні органаў кіравання бібліятэчнай справай і бібліятэчна-інфармацыйнымі ўстановамі ў Рэспубліцы Беларусь. Характарыстыка ўзроўняў, на якіх функцыянуюць інстытуты ўлады і грамадска-прафесійныя інстытуты: міжнародны, нацыянальны, рэгіянальны, ведамасна-галіновы, лакальны.

Бібліятэчнае заканадаўства як сістэма нарматыўных прававых актаў. Структура бібліятэчнага заканадаўства. Сутнасць вертыкальнай (іерархічнай) і гарызантальнай структур бібліятэчнага заканадаўства. Асноўныя нарматыўныя прававыя акты, якія складаюць прававую базу дзейнасці бібліятэк. Прыклады заканадаўчых актаў і падзаконных (агульных, ведамасных, лакальных).

Роля грамадска-прафесійных аб’яднанняў у прававым забеспячэнні дзейнасці бібліятэк.

*Тэма 3. Фарміраванне бібліятэчнага заканадаўства Рэспублікі Беларусь*

Станаўленне і развіццё бібліятэчнага заканадаўства Рэспублікі Беларусь. Этапы развіцця заканадаўства. Паступовасць прыняцця асноўных нарматыўных прававых актаў, якія ляглі ў аснову рэгулявання праваадносін, узнікаючых у працэсе дзеяння бібліятэк Рэспублікі Беларусь.

Знешнія фактары і працэсы, якія абумоўліваюць неабходнасць распрацоўкі тых ці іншых нарматыўных прававых актаў. Роля інстытутаў улады і грамадска-прафесійных інстытутаў у распрацоўцы і рэалізацыі нарматыўных прававых актаў, якія рэгулююць дзейнасць бібліятэк Беларусі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Значэнне міжнароднага супрацоўніцтва паміж краінамі па ўпарадкаванні прававога поля міжбібліятэчнага ўзаемадзеяння і інфармацыйнага супрацоўніцтва для фарміравання прававой базы дзейнасці бібліятэк Рэспублікі Беларусь. Мадэльны Бібліятэчны кодэкс для краін – удзельнікаў СНД як рэкамендацыйны акт для распрацоўкі і ўдасканалення нацыянальных заканадаўчых і нарматыўных актаў у галіне бібліятэчнай справы. Дакументы IFLA і іх роля ў абагульненні вопыту бібліятэк і фармуляванні кіруючых прынцыпаў развіцця сучасных бібліятэк.

*Тэма 4. Бібліятэкі і аўтарскае права*

Нарматыўныя прававыя акты, якія складаюць прававую базу аховы аўтарскіх правоў. Аб'екты аўтарскага права. Асноўныя палажэнні Закона Рэспублікі Беларусь «Аб аўтарскім праве і сумежных правах», якія датычацца дзейнасці бібліятэк. Прававыя асновы свабоднага выкарыстання бібліятэкамі правамерна апублікаваных твораў як прадуктаў інтэлектуальнай працы, іх мэтавага ўзнаўлення (рэпрадуцыравання, электроннага капіравання і інш.) у адпаведным аб'ёме. Тэрмін дзеяння аўтарскага права. Віды і змест аўтарскіх дагавораў.

Бібліятэка як трымальнік (захавальнік), распаўсюджвальнік (пасрэднік) і стваральнік (вытворца) інтэлектуальнай прадукцыі: асаблівы прававы рэжым дзейнасці. Прававы статус службовага твора.

Прадастаўленне карыстальнікам доступу да знешніх інфармацыйных рэсурсаў з дапамогай Інтэрнэту ў кантэксце палажэнняў заканадаўства аб аўтарскім праве. Асноўныя прававыя праблемы аховы аўтарскіх правоў у сферы дзейнасці бібліятэк.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Раздзел 2. ПРАВАВЫЯ АСНОВЫ ДЗЕЙНАСЦІ БІБЛІЯТЭК РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

*Тэма 5. Прававая база стварэння і развіцця бібліятэк і бібліятэчных сетак Рэспублікі Беларусь*

Асноўныя нарматыўныя прававыя акты Рэспублікі Беларусь і іх палажэнні, якія накіраваны на стварэнне заканадаўчых умоў: фінансавага і матэрыяльнага забеспячэння дзейнасці бібліятэк; узаемадзеяння бібліятэк са стваральнікамі; дабрачын-

най дапамогі і спонсарства ў дачыненні да бібліятэк; прадпрымальніцкай дзейнасці бібліятэк. Гарантаванае фінансаванне дзяржаўных бібліятэк як абавязак дзяржавы ў галіне бібліятэчнай справы.

Прававыя асновы ўзаемадзеяння бібліятэк са стваральнікамі (адносіны ўласнасці, фінансаванне бібліятэк, атрыманне бібліятэкай статусу юрыдычнай асобы, рэарганізацыя і ліквідацыя бібліятэк). Арганізацыйныя формы існавання бібліятэк: самастойная ўстанова, філіял, структурнае падраздзяленне. Парадак стварэння бібліятэк. Юрыдычны статус бібліятэкі. Праваздольнасць распараджэння маёмасцю. Заканадаўчыя асновы рэарганізацыі і ліквідацыі бібліятэк.

Правамернасць дабрачыннай дапамогі і спонсарства ў дачыненні да бібліятэк як некамерцыйных устаноў, стан прававых асноў заахвочвання патэнцыяльных дабрачынцаў і спонсараў. Прававое рэгуляванне прадпрымальніцкай дзейнасці бібліятэк. Заканадаўча прадугледжаныя формы ініцыятыўнай дзейнасці бібліятэк. Пытанні ліцэнзавання асобных кірункаў дзейнасці бібліятэк.

*Тэма 6. Прававая база фарміравання інфармацыйных рэсурсаў бібліятэк Рэспублікі Беларусь*

Асноўныя нарматыўныя прававыя акты Рэспублікі Беларусь і іх палажэнні, якія рэгулююць адносіны, узнікаючыя пры камплектаванні бібліятэчнага фонду рознымі відамі тыражыраваных дакументаў (друкаваных, электронных выданняў); фарміраванні электронных рэсурсаў (знешніх і лакальных); арганізацыі бібліятэчных інфармацыйных рэсурсаў (улік, забеспячэнне захаванасці, развіццё сістэмы дэпазітарнага захавання); выключэнні дакументаў з ліку інфармацыйных рэсурсаў (фонду) бібліятэкі.

Прававая база набыцця дакументаў і падпіскі на перыядычныя выданні. Заканадаўства аб абавязковым экзэмпляры дакументаў. Прававыя асновы камплектавання электронных фондаў бібліятэк. Асаблівасці прававой базы дакументаабмену паміж бібліятэкамі і іншымі юрыдычнымі і фізічнымі асобамі, узроўні дакументаабмену.

Асноўныя праваадносіны, якія ўзнікаюць пры арганізацыі бібліятэчнага фонду. Прававое рэгуляванне ўліку і захаванасці



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

бібліятэчных фондаў. Юрыдычныя асновы фізічнай захаванасці фондаў, бяспекі інфармацыйных рэсурсаў у электроннай форме; абароны аўтарскіх правоў на ствараемую ў бібліятэках інтэлектуальную прадукцыю; перамяшчэння фондаў, якія з'яўляюцца культурнай каштоўнасцю, праз дзяржаўную граніцу.

Прававыя асновы выключэння дакументаў з ліку інфармацыйных рэсурсаў (фонду) бібліятэкі і кіравання бібліятэчным фондам.

### *Тэма 7. Прававая база абслугоўвання карыстальнікаў бібліятэк Рэспублікі Беларусь*

Асноваўтваральныя нарматыўныя прававыя акты, якія закладваюць прававыя асновы інфармацыйнага, бібліятэчнага, даведачна-бібліяграфічнага абслугоўвання ў Рэспубліцы Беларусь.

Прававая база забеспячэння канстытуцыйнага права кожнага грамадзяніна на пошук і атрыманне інфармацыі. Выключэнні, якія прапісаны ў заканадаўстве, і звязаны з абмежаваннем доступу да бібліятэчна-інфармацыйных рэсурсаў бібліятэк. Прававыя асновы аказання платных і бясплатных паслуг бібліятэкамі. Стан прававой базы абслугоўвання грамадзян з абмежаванымі магчымасцямі, суадносіны беларускага заканадаўства з міжнароднымі нормамі і рэкамендацыямі па гэтаму кірунку прававога рэгулявання.

Прававыя асновы аховы аўтарскіх правоў у працэсе абслугоўвання карыстальнікаў бібліятэк. Прававое рэгуляванне забеспячэння якасці прадукцыі і паслуг, якія падрыхтоўваюцца і аказваюцца бібліятэкамі. Абарона правоў карыстальнікаў.

### *Тэма 8. Прававая база ўзаемадзеяння работадаўцы з персаналам*

Нарматыўныя прававыя акты Рэспублікі Беларусь, якія рэгулююць узаемаадносіны работадаўцаў з кадрамі бібліятэк. Акты цэнтралізаванага рэгулявання: Кодэксы Рэспублікі Беларусь, Указы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, адпаведныя законы і пастановы. Сістэма актаў лакальнага характару: загады па кадравых пытаннях дырэктара (па прыёме, звальненні, пераводах), кантракты, палажэнні аб структурных падраздзяленнях, інструкцыі, стандарты і г. д.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Роля прафсаюзных арганізацый у рэгуляванні працоўных адносін. Калектыўныя дагаворы.

Асноўныя працоўныя праваадносіны, якія ўзнікаюць на аснове працоўнага дагавора. Адносіны, якія ўзнікаюць наконт аплаты працы, сацыяльных гарантый, прымянення розных ільгот і сістэмы заахвочванняў і пакаранняў (дысцыплінарных спагнанняў), аховы працы. Адносіны, звязаныя з падрыхтоўкай і перападрыхтоўкай кадраў, павышэннем кваліфікацыі.

### *Тэма 9. Прававая база фарміравання і выкарыстання матэрыяльна-тэхнічнай базы бібліятэк Рэспублікі Беларусь*

Асноўныя нарматыўныя прававыя акты Рэспублікі Беларусь і іх палажэнні, якія замацоўваюць нормы аб матэрыяльна-тэхнічным забеспячэнні бібліятэк. Узаемасувязь матэрыяльна-тэхнічнага стану бібліятэк з адносінамі ўласнасці і з прававымі палажэннямі, якія датычацца фінансавага забеспячэння дзейнасці бібліятэк.

Валоданне, карыстанне і распараджанне бібліятэкамі замацаванай за імі маёмасцю на праве аператыўнага кіравання, сутнасць гэтага права.

Прававыя асновы аўтаматызацыі дзейнасці бібліятэк. Роля дзяржаўнай палітыкі ў галіне інфарматызацыі бібліятэк.

### *Тэма 10. Сістэма ўнутрыбібліятэчнай нарматыўна-прававой дакументацыі*

Сістэма лакальных нарматыўна-прававых дакументаў, якія забяспечваюць арганізацыйную дзейнасць бібліятэкі, сутнасць гэтай сістэмы. Спецыяльныя функцыі арганізацыйна-прававых дакументаў бібліятэкі: кіраўнічая, прававая. Асноўныя лакальныя арганізацыйна-прававыя дакументы, якія ўстанаўліваюць статус арганізацыі, яе кампетэнцыю, структуру, функцыянальны змест дзейнасці ўстановы ўвогуле, яе падраздзяленняў і работнікаў, іх правы, абавязкі і інш. Агульная характарыстыка гэтых дакументаў: патрабаванні да іх, структура дакументаў.

Устаноўчыя дакументы бібліятэкі: статут (палажэнне). Штатны расклад. Правілы ўнутранага працоўнага распарадку бібліятэкі як дакумент, які адлюстроўвае спецыфіку прымянення норм працоўнага заканадаўства ў канкрэтных умовах. Правілы карыстання бібліятэкай. Палажэнні аб структурных пад-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

раздзяленнях бібліятэкі. Палажэнні аб асобных аспектах дзейнасці (платных паслугах, дагаворных адносінах, залогавай практыцы, матэрыяльным стымуляванні супрацоўнікаў і інш.). Інструкцыі. Службовыя інструкцыі супрацоўнікаў. Загады і распараджэнні дырэктара (загадчыка) бібліятэкі як прававая аператыўна-распарадчая дакументацыя: юрыдычны статус, патрабаванні да афармлення. Пастановы (рашэнні) калегіяльных і прадстаўнічых грамадскіх органаў кіравання бібліятэкай (камісій, саветаў, сходаў, нарад і інш.), іх правамоцнасць.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ

| Назва раздзела, тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | | | Колькасць гадзін КСР | Форма кантролю ведаў |
|---|---|---|---|---|---|
| | лекцыі | практычныя заняткі | семінарскія заняткі | | |
| *Уводзіны* | 1 | | | | |
| **Раздзел 1. Бібліятэка ў сістэме прававых адносін** | | | | | |
| *Тэма 1.* Бібліятэка як суб'ект дзяржаўнага кіравання і прававога рэгулявання | 1 | 2 | | | вуснае апытанне |
| *Тэма 2.* Сутнасць прававога забеспячэння дзейнасці бібліятэк | 1 | | | | вуснае апытанне |
| *Тэма 3.* Фарміраванне бібліятэчнага заканадаўства Рэспублікі Беларусь | 1 | 2 | | | вуснае апытанне |
| *Тэма 4.* Бібліятэкі і аўтарскае права | 2 | | 2 | 2 | рэферат, вуснае апытанне |
| **Раздзел 2. Прававыя асновы дзейнасці бібліятэк Рэспублікі Беларусь** | | | | | |
| *Тэма 5.* Прававая база стварэння і развіцця бібліятэк і бібліятэчных сетак Рэспублікі Беларусь | 2 | 2 | | | рэферат, вуснае апытанне |
| *Тэма 6.* Прававая база фарміравання інфармацыйных рэсурсаў бібліятэк Рэспублікі Беларусь | 2 | 2 | 2 | | рэферат, вуснае апытанне |
| *Тэма 7.* Прававая база абслугоўвання карыстальнікаў бібліятэк Рэспублікі Беларусь | 2 | 2 | | 2 | рэферат, вуснае апытанне |
| *Тэма 8.* Прававая база ўзаемадзеяння работадаўцы з персаналам | 1 | | | 2 | рэферат |
| *Тэма 9.* Прававая база фарміравання і выкарыстання матэрыяльна-тэхнічнай базы бібліятэк Рэспублікі Беларусь | 1 | | | | рэферат |
| *Тэма 10.* Сістэма ўнутрыбібліятэчнай нарматыўна-прававой дакументацыі | 2 | 2 | | 2 | рэферат, вуснае апытанне |
| **Усяго…** | **16** | **12** | **4** | **8** | |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

## Літаратура

*Асноўная*

*1.* Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб культуры : 20 ліп. 2016 г. № 413-З : прыняты Палатай прадстаўнікоў 24 чэрв. 2016 г. : адобр. Саветам Рэсп. 30 чэрв. 2016 г. / адк. за вып. Н. В. Судзілоўская. – Мінск : Нац. цэнтр прававой інфармацыі Рэсп. Беларусь, 2016. – 270 с. ; То же [Электронный ресурс] // Нац. правовой интернет-портал Респ. Беларусь. – Режим доступа: http://www.pravo.by/document/?guid=12551&pO=Hk1600413&p1=1. – Дата доступа: 23.01.2017.

*2.* Гражданский кодекс Республики Беларусь [Электронный ресурс]: принят Палатой представителей 28 окт. 1998 г.; одобр. Советом Респ. Беларусь 19 нояб. 1998 г. // Эталон-ONLINE: инф.-поисковая система. – Режим доступа: http://etalonline.by/?type=text&regnum=HK9800218#load_text_none_1, свободный. – Загл. с экрана. – Яз. рус. – Дата доступа: 12.10.2016.

*3.* Об авторском праве и смежных правах [Электронный ресурс]: Закон Респ. Беларусь от 17 мая 2011 г., № 262-З // Pravo.by. Нац. правовой интернет-портал Респ. Беларусь. – Режим доступа: http://www.pravo.by/pdf/2011-60/2011-60(015-082).pdf, свободный. – Загл. с экрана. – Яз. рус. – Дата доступа: 21.10.2016.

*4.* Об информации, информатизации и защите информации [Электронный ресурс] : Закон Респ. Беларусь ад 10 нояб. 2008 г., № 455-З // Pravo.by. Нац. правовой интернет-портал Респ. Беларусь. – Режим доступа: http://www.pravo.by/webnpa/text.asp?RN=h10800455, свободный. – Загл. с экрана. – Яз. рус. – Дата доступа: 12.10.2016.

*5. Бойкова, О. Ф.* Библиотечно-информационные ресурсы в электронной форме в законодательстве об авторском праве / О. Ф. Бойкова // Библиотековедение. – 2012. – № 6. – С. 34–38.

*6. Бубекина, Н. В.* Сравнительный анализ отражения интересов библиотек и их пользователей в законодательстве стран СНГ, Балтии и Грузии / Н. В. Бубекина // Вестн. Библ. ассамблеи Евразии. – 2015. – № 1. – С. 38–42.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

7. *Галковская, Ю. Н.* Информационный рынок и его правовое обеспечение : учеб.-метод. комплекс / Ю. Н. Галковская ; Белорус. гос. ун-т культуры и искусств. – Минск : БГУКИ, 2017. – С. 88–108, 115–119, 125–130.

8. *Галковская, Ю. Н.* Правовое обеспечение деятельности библиотек в Республике Беларусь: науч.-практ. пособие / Ю. Н. Галковская. – Минск : Новое знание, 2008. – С. 21–67, 126–163.

9. *Жукова, Е. А.* Проблемы регулирования деятельности публичных библиотек в сфере авторского права / Е. А. Жукова // Библиосфера. – 2015. – № 4. – С. 61–64.

10. *Замаева, Н. М.* Функцыянаванне профільнай нарматыўнай базы ў 2006–2010 гг. / Н. М. Замаева // Агляд дзейнасці бібліятэк сістэмы Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь (2006–2010) [Электронны рэсурс]. – Мінск : НББ, 2012. – 1 CD.

11. *Риден, И.* Правовые ограничения и цифровая библиотека: достижим ли электронный доступ к знанию? / И. Риден // Науч. и техн. б-ки. – 2014. – № 8. – С. 38–48.

*Дадатковая*

1. *Вахрушев, М. В.* Правовые аспекты использования электронных библиотек в вузе / М. В. Вахрушев // Науч. и техн. б-ки. – 2015. – № 5. – С. 44–53.

2. *Джиго, А. А.* Как сформировать единое пространство знаний. Стратегия ИНИОН по разработке нормативных документов в библиотечно-информационной сфере / А. А. Джиго, Т. В. Майстрович // Библиотечное дело. – 2016. – № 6. – С. 30–32.

3. Законодательство европейских государств о библиотечном деле и обязательном экземпляре документов : сб. / науч. ред. и сост.: Н. В. Дунаева, Р. А. Гимадеев, К. Н. Княгинин [и др.]. – СПб. : Президентская библиотека, 2015. – 255 с.

4. *Замаева, Н.* Основные векторы развития библиотек Беларуси в 2016–2020 гг. сквозь призму стратегических документов / Н. Замаева // Бібліятэчны свет. – 2016. – № 3. – С. 8–9.

5. *Земсков, А. И.* «Авторское право» в профессиональном сознании и профессиональной речи / А. И. Земсков // Науч. и техн. б-ки. – 2015. – № 4. – С. 63–65.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*6.* Манифест ИФЛА о цифровых библиотеках // Библиография. – 2015. – № 3. – С. 153–156.

*7.* Манифест ИФЛА об Интернете (версия 2014) // Библиотековедение. – 2015. – № 1. – С. 91–92.

*8. Печинина, Д. А.* Юридический комментарий к законодательству об обязательном экземпляре документов / Д. А. Печинина // Библиография. – 2015. – № 2. – С. 89–106.

*9. Пшибытко, М.* Роль национальной библиотеки в нормативном правовом обеспечении деятельности библиотек страны / М. Пшибытко // Бібліятэчны свет. – 2012. – № 4. – С. 27.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Характарыстыка рэкамендаваных педагагічных тэхналогій і метадаў выкладання

З ліку эфектыўных педагагічных метадаў і тэхналогій навучання, якія садзейнічаюць набыццю студэнтамі тэарэтычных, арганізацыйна-метадычных ведаў у галіне прававога забеспячэння дзейнасці бібліятэк і фарміравання ў іх вопыту самастойнага вырашэння разнастайных задач, вылучаюцца наступныя:

– тэхналогіі вучэбна-даследчыцкай дзейнасці;

– праектныя тэхналогіі;

– тэхналогія праблемнага навучання (праблемнае выкладанне, часткова пошукавы метад), якая рэалізуецца на лекцыйных занятках;

– тэхналогія навучання як вучэбнага даследавання, якая рэалізуецца на практычных занятках і пры самастойнай рабоце студэнта;

– камунікатыўныя тэхналогіі, заснаваныя на актыўных формах і метадах навучання (дыскусія, спрэчка-дыялог, вучэбныя дэбаты, круглы стол і інш.);

– тэарэтыка-інфармацыйныя метады: дыялагічна пабудаванага вуснага выкладання вучэбнага матэрыялу, тлумачэння паняццяў і сутнасці прававых з'яў, вывучэння нарматыўных прававых актаў;

– практыка-аперацыйныя метады: рабочыя лісты, канструяванне правілаў у рамках праваадносін, якія ўзнікаюць пры функцыянаванні бібліятэкі;

– пошукава-эўрыстычныя метады: аналіз нарматыўных прававых актаў, аналіз прававых сітуацый, метад кейсаў (аналіз сітуацый).

Пры вывучэнні вучэбнай дысцыпліны «Прававое забеспячэнне дзейнасці бібліятэк» выкарыстоўваюцца наступныя формы: пазааўдыторная і аўдыторная, групавая і індывідуальная.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Рэкамендаваныя сродкі дыягностыкі вынікаў вучэбнай дзейнасці

Для ацэнкі вучэбных дасягненняў студэнтаў выкарыстоўваюцца крытэрыі, зацверджаныя Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь.

Для ацэнкі дасягненняў студэнтаў па вучэбнай дысцыпліне і дыягностыкі ўзроўню засваення ведаў і ўменняў па вучэбнай дысцыпліне рэкамендаваны наступны інструментарый:

– падрыхтоўка рэфератаў па асобных тэмах, раздзелах дысцыпліны;

– падрыхтоўка прэзентацый;

– вусныя бягучыя кантрольныя апытанні па асобных тэмах у час заняткаў;

– абарона заданняў, выкананых на практычных занятках;

– вуснае апытанне студэнтаў на семінарах;

– абарона выкананых у рамках кіруемай самастойнай работы індывідуальных (групавых) заданняў;

– экзамен – для выніковай дыягностыкі кампетэнцыі студэнта па дысцыпліне.

Ацэнка вучэбных дасягненняў студэнтаў ажыццяўляецца з улікам актыўнасці работы студэнта на лекцыйных, семінарскіх, практычных занятках, а таксама з улікам дасягненняў і выконвання ім кіруемай самастойнай работы.

Для вымярэння ступені адпаведнасці вучэбных дасягненняў студэнта патрабаванням адукацыйнага стандарту рэкамендуецца выкарыстоўваць праблемныя, творчыя задачы, якія прадугледжваюць эўрыстычную дзейнасць і нефармалізаваны адказ.

## Метадычныя рэкамендацыі па арганізацыі і выкананні самастойнай работы студэнтаў па вучэбнай дысцыпліне

Арганізацыя самастойнай работы студэнтаў прадугледжвае работу з навуковай і вучэбна-метадычнай літаратурай, вывучэнне студэнтамі асобных пытанняў дысцыпліны, падрыхтоўку да семінарскіх заняткаў і экзамену.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Самастойная работа выконваецца ў любой рэкамендаванай форме па раздзелах: «Бібліятэка ў сістэме прававых адносін», «Прававыя асновы дзейнасці бібліятэк Рэспублікі Беларусь» па адной з тэм, якія прыведзены ніжэй. Яна павінна мець тытульны ліст, асноўную частку і спіс выкарыстаных крыніц.

Тэматыка самастойнай работы з'яўляецца абавязковай, але студэнт мае права звузіць ці пашырыць абраную тэму. Пры напісанні работы можна выкарыстоўваць спіс асноўнай і дадатковай літаратуры па дысцыпліне.

Формы выканання самастойнай работы:

– напісанне рэферата (не менш 12 старонак);

– распрацоўка візуальнай прэзентацыі з дапамогай Power Point (не менш 12 слайдаў).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Прыкладны пералік тэм кіруемай самастойнай работы студэнтаў па вучэбнай дысцыпліне

*Раздзел I.* Бібліятэка ў сістэме прававых адносін

1. Бібліятэка як суб'ект прававога рэгулявання: агульная характарыстыка.
2. Асноўныя суб'екты і аб'екты праваадносін у сферы дзейнасці бібліятэк, іх правы і абавязкі.
3. Асноўныя групы праваадносін, якія ўзнікаюць у працэсе дзейнасці бібліятэк: агульная характарыстыка.
4. Прынцыпы інфармацыйнага права як аснова прававога рэгулявання дзейнасці бібліятэк.
5. Бібліятэчнае заканадаўства: вертыкальная і гарызантальная структура.
6. Сучасны стан бібліятэчнага заканадаўства Рэспублікі Беларусь.
7. Правы і абавязкі бібліятэк Рэспублікі Беларусь.
8. Уніфікацыя бібліятэчнага заканадаўства розных краін свету.
9. Развіццё бібліятэчнага заканадаўства ў канцы XX – пачатку XXI стагоддзяў: асноўныя тэндэнцыі і перспектывы.
10. Бібліятэчнае заканадаўства замежных краін (на прыкладзе адной ці некалькіх краін Еўропы).
11. Дзейнасць міжнароднай бібліятэчнай грамадскасці ў галіне ўдасканалення бібліятэчнага заканадаўства.
12. Дзейнасць міжнародных арганізацый па збліжэнні бібліятэчнага заканадаўства розных краін свету.
13. Даведачна-прававыя сістэмы: арганізацыя доступу грамадзян да прававой інфармацыі ў публічных цэнтрах прававой інфармацыі пры бібліятэках.
14. Аўтарскае права: сутнасць паняцця. Сфера дзеяння аўтарскага права.
15. Бібліятэкі і аўтарскае права. Асноўныя праблемы аховы аўтарскіх правоў у сферы дзейнасці бібліятэк, агульная характарыстыка.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## *Раздзел II.* Прававыя асновы дзейнасці бібліятэк Рэспублікі Беларусь

16. Прававыя асновы ўзаемадзеяння бібліятэк Рэспублікі Беларусь з заснавальнікамі.
17. Прававая база фінансавага забеспячэння бібліятэк Рэспублікі Беларусь.
18. Прававая база прадпрымальніцкай дзейнасці бібліятэк Рэспублікі Беларусь.
19. Прававая база камплектавання бібліятэчных фондаў Рэспублікі Беларусь: агульная характарыстыка.
20. Фарміраванне электронных інфармацыйных рэсурсаў бібліятэкамі Рэспублікі Беларусь: прававы аспект.
21. Прававая база перакладу бібліятэчных фондаў Рэспублікі Беларусь на традыцыйных носьбітах у электронную форму.
22. Прававая база атрымання бібліятэкамі Рэспублікі Беларусь абавязковых экзэмпляраў дакументаў.
23. Прававая база дакументаабмену паміж бібліятэкамі і іншымі юрыдычнымі і фізічнымі асобамі.
24. Прававыя асновы забеспячэння захаванасці бібліятэчных фондаў Рэспублікі Беларусь.
25. Прававыя асновы ўліку бібліятэчных фондаў Рэспублікі Беларусь.
26. Прававыя асновы забеспячэння права кожнага грамадзяніна на пошук і атрыманне інфармацыі.
27. Бібліятэчнае абслугоўванне карыстальнікаў Рэспублікі Беларусь: прававы аспект.
28. Прававыя асновы забеспячэння бібліятэкамі Рэспублікі Беларусь якасці прадастаўляемых прадуктаў і паслуг.
29. Прававыя асновы працоўных адносін у бібліятэках.
30. Прававое забеспячэнне кіравання кадрамі бібліятэкі.
31. Сістэма лакальных нарматыўна-прававых дакументаў бібліятэкі.
32. Статут бібліятэкі (палажэнне аб бібліятэцы): агульная характарыстыка.
33. Штатны расклад бібліятэкі: агульная характарыстыка.
34. Правілы ўнутранага працоўнага распарадку бібліятэкі: агульная характарыстыка.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

35. Правілы карыстання бібліятэкай: агульная характарыстыка.

36. Палажэнні аб структурных падраздзяленнях бібліятэкі: агульная характарыстыка.

37. Службовая інструкцыя супрацоўніка бібліятэкі: агульная характарыстыка.

38. Інструкцыя па асобным відзе дзейнасці бібліятэкі: агульная характарыстыка.

39. Прававыя асновы стварэння, ліквідацыі і развіцця бібліятэк і бібліятэчных сетак Рэспублікі Беларусь.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Крытэрыі ацэнкі вынікаў вучэбнай дзейнасці студэнтаў

| Адзнака | Паказчыкі адзнакі |
|---|---|
| 1 (адзін) | Веданне студэнтам асобных фактаў, з'яў і тэрмінаў вывучаемай дысцыпліны. Спецыяльныя агульнатэарэтычныя веды фрагментарныя і бессістэмныя |
| 2 (два) | Устойлівая фіксацыя ў памяці студэнта асобных фактаў, з'яў і тэрмінаў вывучаемай дысцыпліны |
| 3 (тры) | Аднаўленне студэнтам часткі праграмнага матэрыялу па памяці. Ізаляванасць ведаў па асобных тэмах, персаналіях, крыніцах. Уяўленне аб прававых з'явах, якія тычацца дзейнасці бібліятэк, носіць ненавуковы характар |
| 4 (чатыры) | Недастаткова сістэмнае ўсведамленне студэнтам вывучаемай дысцыпліны: прыгадвае і часткова прыводзіць паняцці, звесткі, факты, якія тычацца прававых аспектаў функцыянавання бібліятэк. Адказы даюцца са значнымі лагічнымі памылкамі. Веданне нарматыўных прававых актаў, даследчай і навукова-метадычнай літаратуры |
| 5 (пяць) | Усведамленне большай часткі праграмнага вучэбнага матэрыялу: асаблівасцей, сутнасці прававога забеспячэння дзейнасці бібліятэк, асноўных напрамкаў удасканалення бібліятэчнага заканадаўства. Наяўнасць неістотных памылак |
| 6 (шэсць) | Сістэмнае ўсведамленне большай часткі праграмнага вучэбнага матэрыялу. Веданне асноўнай навуковай літаратуры, нарматыўных прававых актаў, якія рэгулююць дзейнасць бібліятэк. Наяўнасць неістотных памылак |
| 7 (сем) | Поўныя, трывалыя веды. Разгорнутае апісанне і тлумачэнне аб'ектаў вывучэння, раскрыццё ролі бібліятэчнага заканадаўства ў рэгуляванні праваадносін, што ўзнікаюць у працэсе функцыянавання бібліятэк. Уменне аналізаваць прававыя з'явы. Наяўнасць адзінкавых неістотных памылак |
| 8 (восем) | Поўныя, трывалыя, глыбокія веды. Свабоднае аперыраванне вучэбным матэрыялам дысцыпліны. Раскрыццё сутнасці тэарэтычных пытанняў, пацвярджэнне аргументамі і фактамі, спасылкамі на палажэнні нарматыўных прававых актаў. Веданне асноўнай і дадатковай літаратуры па дысцыпліне. Наяўнасць адзінкавых неістотных памылак |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| | |
|---|---|
| 9 (дзевяць) | Усведамленне студэнтам сутнасных характарыстык прававаога забеспячэння дзейнасці бібліятэк, яго сістэмы заканадаўчых, падзаконных, у тым ліку лакальных нарматыўных прававых актаў. Раскрыццё сутнасці прававых з’яў, тэарэтычных пытанняў, пацвярджэнне аргументамі і прыкладамі. Уменне карыстацца прававымі актамі ў працэсе рашэння практычных праблем на прававой аснове. Наяўнасць адзінкавых неістотных памылак |
| 10 (дзесяць) | Устойлівае валоданне ключавымі паняццямі. Наяўнасць сістэматызаваных, глыбокіх і поўных ведаў у галіне прававых асноў дзейнасці бібліятэк. Выкарыстанне навуковай, спецыяльнай тэрміналогіі. Глыбокае асэнсаванне праблем прававаога забеспячэння дзейнасці бібліятэк. Веданне сістэмы нарматыўных прававых актаў, якія рэгулююць дзейнасць бібліятэк. Уменне прымяняць свае веды ў кантэксце прафесійнай дзейнасці, рашаць практычныя, практыка-арыентаваныя задачы з улікам набытых ведаў, карыстацца нарматыўнымі прававымі актамі |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Вучэбнае выданне*

# ПРАВАВОЕ ЗАБЕСПЯЧЭННЕ ДЗЕЙНАСЦІ БІБЛІЯТЭК

*Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі*
*па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасці*
*1-23 01 11 Бібліятэчна-інфармацыйная дзейнасць (па напрамках),*
*напрамку спецыяльнасці 1-23 01 11-01 Бібліятэчна-інфармацыйная*
*дзейнасць (менеджмент)*


Карэктар В. Б. Кудласевіч
Тэхнічны рэдактар А. У. Гіцкая

Падпісана ў друк 2017. Фармат 60x84 $^{1}/_{16}$.
Папера офісная. Рызаграфія.
Ум. друк. арк. 1,58. Ул.-выд. арк. 0,97. Тыраж экз. Заказ .

Выдавец і паліграфічнае выкананне:
установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 1/177 ад 12.02.2014.
ЛП № 02330/456 ад 23.01.2014.
Вул. Рабкораўская, 17, 220007, г. Мінск.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ